Такім чынам, практычныя заняткі па методыцы выкладання беларускай мовы садзейнічаюць развіццю навыкаў самападрыхтоўкі, прафесійна-метадычных уменняў, творчых здольнасцей будучых настаўнікаў беларускай мовы.

## Літаратура


1. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]. – 2022. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/3781-metodicheskie-rekomendatsii.html. – Дата доступу: 10.09.2022.
2. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам [Электронный ресурс]. – 2022. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/304-uchebnyepredmety-v-xi-klassy-2022-2023/3798-belaruskaya-mova.html. – Дата доступа: 15.09.2022.



*А. Д. Свецянкоў, Л. Г. Клімовіч (Беларусь)*


# «А КЛАСІК – НІЧОГА НЕ АДЧУВАЕ, БО ЁН – БРОНЗАВЫ»: СКУЛЬПТУРНЫЯ ПОМНІКІ Г. МІНСКА І ПАЭЗІЯ МАКСІМА ТАНКА

Сучасны Мінск упрыгожвае вялікая колькасць помнікаў, мемарыялаў, стэл і абеліскаў, бюстаў, мемарыяльных дошак, месцаў ушанавання дзеячаў нацыянальнай гісторыі і культуры.

У Беларусі скульптура як від мастацтва атрымлівае вялікае развіццё ў XIX – пачатку XX ст. У 1930-я гады скульптары Андрэй Бембель, Міхаіл Керзін, Заір Азгур, Аляксей Глебаў, Аляксандр Арлоў афармляюць Дом урада ў Мінску партрэтамі і тэматычнымі рэльефамі. Скульптурамі былі ўпрыгожаны Дом Чырвонай Арміі, Оперны тэатр, Палац піянераў.

У пасляваенныя гады ў скульптуры пераважала ваенная тэматыка, услаўляўся подзвіг народа, з’яўляліся партрэты абаронцаў Радзімы, Герояў Савецкага Саюза.

У 1952 г. на скрыжаванні вуліц Чырвонаармейскай і Карла Маркса сваё месца заняў помнік «Танк-вызваліцель» як увасабленне перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пра яго Максім Танк узгадвае ў вершы «Калі не верыце» (1988): «І, нарэшце, / Спытаць у гвардзейскага танка, / Што тады салютаваў / І сягоння / Красуецца на п’едэстале» [3, с. 139].

1960–1970-я гг. вызначаліся імкненнем скульптараў да філасофскага абагульнення, стварэння сімвалічна-алегарычных кампазіцый, нацыянальных традыцый. Таму значна пашырыліся скульптурныя кампазіцыі, прысвечаныя дзеячам беларускай культуры [4].

Так, у цэнтры плошчы Якуба Коласа ў 1972 г. у сувязі з 90-годдзем з дня нараджэння ўсталяваны помнік народнаму паэту. Па задуме скульптараў і архітэктараў Заіра Азгура, Юрыя Градава, Георгія Заборскага і Леаніда Левіна помнік уяўляе сабой скульптурную кампазіцыю, у цэнтры якой выдзяляецца фігура паэта, які сядзіць на камені. Па баках помніка знаходзяцца дзве скульптурныя групы – «Дзед Талаш» і «Сымон-музыка».

Даволі дакладнае апісанне помніка народнаму паэту можна знайсці ў вершы Максіма Танка «Ля помніка Якубу Коласу» (1974): «Ён з песняю непераможнай / Край абышоў і ўсіх сяброў. / Пасля няспынных падарожжаў / Вярнуўся, стомлены, дамоў. / Прысеў на валуне гранёным, / Дзе на Маскву імкне шаша, / Паслухаць музыкі Сымона, / Гамонкі дзеда Талаша…» [2, с. 55].

Яшчэ адной значнай фігурай у беларускай літаратуры з’яўляецца Янка Купала. У 1962 г., як даніна глыбокай павагі да паэта, адкрыўся парк, названы яго імем. Да 90-годдзя песняра ў 1972 г. была праведзена рэканструкцыя парка. Тут створаны Купалаўскі мемарыяльны архітэктурна-скульптурны комплекс. У парку размясціліся помнік песняру, фантан «Вянок» і Літаратурны музей Янкі Купалы. Аўтары помніка – беларускія скульптары Анатоль Анікейчык, Андрэй Заспіцкі, Леў Гумілеўскі, архітэктары – Юрый Градаў, Леанід Левін – атрымалі за яго стварэнне Дзяржаўную прэмію БССР [5].

Фігура паэта размешчана на нізкім гранітным пастаменце, які паступова павышаецца злева направа. На левым краі пастамента змяшчаецца магутная бронзавая фігура Янкі Купалы. Паэт ідзе, абапіраючыся на кій, у накінутым на плечы паліто.

Дакладна перадаў Максім Танк у вершы «Ля помніка Янку Купалу» (1973) адчуванне, быццам паэт не спыніўся, а крочыць далей: «Яго сцежка-дарога / перавалаў не знала, / А нястомна ўздымалася / ўгору і ўгору… / …Толькі што ж гэта сцежка / Абрываецца раптам / П’едэстала гранітам? / Але ён – далей крочыць» [2, с. 26–27].

Перад пастаментам размешчаны невялікі вузкі басейн, злева б’е крыніца, побач можна ўбачыць бронзавую папараць-кветку, якая сімвалізуе старажытнае язычніцкае свята Купалле. І гэта не выпадкова. Вядома, што паэт нарадзіўся ў ноч на Купалле, Купала – творчы псеўданім песняра. Усё жыццё Янка Купала шукаў папараць-кветку, жадаючы шчасця не толькі сабе, але і ўсяму беларускаму народу.

Аўтарамі фантана «Вянок» з’яўляюцца ўсё тыя ж Анатоль Анікейчык, Андрэй Заспіцкі і Леў Гумілеўскі. Ён быў перабудаваны ў 1972 г. і ўяўляе сабой круглы басейн, у якім узвышаюцца дзве бронзавыя фігуры дзяўчат, што кідаюць вянкі ў ваду. Дакладнае апісанне гэтага фантана мы знаходзім у вершы Максіма Танка «Ля фантана» (1973): «У тоні фантана / Сузор’яў гараць светлякі, / Варожаць русалкі: / На хвалі пускаюць вянкі… / …І песню спяваюць, / Якую пачуўшы, заўжды / Ты, як заварожаны, / Будзеш прыходзіць сюды. / Паслухаць з Купалам, / Як аж да світальных зарніц / Аб папараці расцвітаючай / Песня звініць» [2, с. 39–40].

Максіма Танка як грамадзяніна сваёй краіны, як чалавека, які прайшоў праз пекла вайны, не магла не крануць жорсткая расправа над яўрэямі ў сакавіку 1942 г. У выніку наведвання месца расстрэлу нарадзіўся верш «Гета» (1946): «Я мусіў быць на гэтым сумным месцы, / Каб праз пустынь гаручыя пяскі, / Каб праз забыўчывую памяць у вякі / Скрыжалі з іх імёнамі пранесці» [1, с. 74].

Мемарыяльны комплекс «Яма» на вуліцы Мельнікайтэ ў Мінску – гэта даніна памяці ўсім яўрэям, якія загінулі ў Мінскім гета ў часы Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пяці тысячам яўрэям, расстраляным у час карнай аперацыі 2 сакавіка 1942 г.

У 1947 г. на месцы расстрэлу ўзнік абеліск з чорнага мармуру са словамі на ідышы: «Яўрэям – ахвярам нацызму».

У 1990-х гг. каля «Ямы» пасадзілі алею Праведнікаў народаў свету. Кожнае дрэва на гэтай алеі падпісана імёнамі праведнікаў. Сёння алея налічвае каля дзясятка дрэў, у будучым плануецца ўшанаваць на алеі імёны ўсіх беларусаў, якія, рызыкуючы сваім жыццём, ратавалі яўрэяў.

Мемарыяльны комплекс «Яма» ў 2000 г. был дапоўнены бронзавай скульптурнай кампазіцыяй «Апошні шлях». Да цэнтра мемарыяла – да ямы – вядзе лесвіца, па якой 27 бронзавых фігур спускаюцца, каб быць забітымі.

Скульптурная кампазіцыя «Апошні шлях» стваралася на працягу васьмі гадоў архітэктарам і кіраўніком праекта Леанідам Левіным, скульптарамі Аляксандрам Фінскім і Эльзай Полак. Праца выконвалася ўручную, без усялякіх машын.

Помнік «Яма» знаходзіцца на месцы яра, у якім і па сённяшні дзень знаходзяцца астанкі каля ста тысяч забітых яўрэяў [5].

На сучасным этапе працягваецца праца па вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры, іх ахове і рэстаўрацыі. З’яўляюцца новыя скульптурныя помнікі: скульптура «Гандляр» каля ўвахода «Заходняга рынку» на вуліцы Бурдэйнага (2014), памятны знак «Гарадскія шалі» (2014) на плошчы Свабоды, скульптура «Настаўніца першая мая» каля ўвахода ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (2014), помнік ляснічаму каля Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (2015) і інш.

Сам Максім Танк у вершы «Прапанова» марыць, каб вуліцы роднага горада ўпрыгожыла скульптура «Лявоніхі», «абцасікі якой не раз / Высякалі іскры з сэрцаў / І палясквалі на падмостках / Сусветных фестываляў» [3, с. 137].

Вялікае развіццё скульптура Беларусі атрымала ў XIX – пачатку XX ст. У 1930-я гг. партрэтамі, тэматычнымі рэльефамі і скульптурамі былі аформлены Дом урада ў Мінску, Дом Чырвонай Арміі, Оперны тэатр, Палац піянераў і акцябрат у Мінску. У скульптуры пасляваеннага часу пераважала ваенная тэматыка, услаўляўся подзвіг народа. У 1960–1970-я гг. з'яўляюцца скульптурныя кампазіцыі, прысвечаныя дзеячам беларускай культуры (Янку Купалу, Якубу Коласу). На сучасным этапе вядзецца праца па захаванні помнікаў гісторыі і культуры, іх ахове і аднаўленні, з'яўляюцца новыя скульптурныя помнікі. У вершах Максіма Танка мы знаходзім апісанні асноўных скульптурных кампазіцый і помнікаў, прысвечаных значным падзеям жыцця Беларусі, дарагіх сэрцу народнага паэта і кожнага беларуса (помнік «Танк-вызваліцель», помнікі Якубу Коласу і Янку Купалу, «Яма» і інш.).

## Літаратура


1. *Танк, М.* Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1978–1981. – Т. 2 : Вершы, паэмы (1945–1954). – 1978. – 464 с.
2. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 5 : Вершы (1972–1982). – 2008. – 448 с.
3. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.
4. *Парашкоў, С. А.* Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 444 с.
5. *Чантурия, В. А.* Памятники и памятные места Беларуси / В. А. Чантурия, Ю. В. Чантурия. – Минск : Харвест, 2015. – 414 с.



*Е. И. Сердюкова (Беларусь)*


# ФУНКЦИОНАЛЬНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ ИНТЕРТЕКСТУАЛЬНЫХ ВКЛЮЧЕНИЙ (НА МАТЕРИАЛЕ СОВРЕМЕННОЙ РУССКОЯЗЫЧНОЙ ПОЭЗИИ БЕЛАРУСИ)

Каждый русскоязычный писатель Беларуси, создавая свои тексты и реализуя в их пространстве межтекстовые взаимодействия различного типа, на первый план ставит собственные целевые установки, согласно которым во вновь созданном тексте доминирует определенная функция интертекстуальности. Однако доминирование одной функции не исключает реализации и некоторых других возможностей интертекстуальных включений. На сегодня существует немало убедительных классификаций функций интертекстуальных элементов.